Журнал Белорусского государственного университета. История. 2020;3:108–110
Journal of the Belarusian State University. History. 2020;3:108–110

# Юбилеи

# Юбілеі

# Jubilees



## Александр Александрович ГУЖАЛОВСКИЙ

## Аляксандр Аляксандравіч ГУЖАЛОЎСКІ

## Alexander Aliaxandravich HUZHALOUSKI

Вядомаму беларускаму гісторыку, музеолагу і педагогу, доктару гістарычных навук, прафесару кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандру Аляксандравічу Гужалоўскаму споўнілася 60 гадоў.

Нарадзіўся А. А. Гужалоўскі 27 чэрвеня 1960 г. у Мінску. У 1983 г. скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. М. Горкага (цяпер – Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка), у 1991 г. – аспірантуру аддзела музеязнаўства Навукова-даследчага інстытута культуры Акадэміі навук СССР у Маскве. Працаваў на розных пасадах у Беларускім дзяржаўным музеі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь. У 1993 г. Аляксандр Аляксандравіч перайшоў на працу на гістарычны факультэт БДУ, дзе спачатку займаў пасаду дацэнта, а з 2004 г. – прафесара.

У 1992 г. А. А. Гужалоўскі абараніў дысертацыю на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці «музеязнаўства» (тэма – «Гісторыя музеяў Беларусі другой паловы XVIII – пачатку XX ст.»), а ў 2002 г. – доктара гістарычных навук па спецыяльнасці «айчынная гісторыя» (тэма – «Станаўленнне і развіццё музейнай справы ў Беларусі (1918–1941 гг.)»). У 2016 г. Аляксандру Аляксандравічу было прысвоена вучонае званне прафесара. Пад яго навуковым кіраўніцтвам абаронены тры кандыдацкія дысертацыі.

У 1994 г. вучоны праходзіў стажыроўку ў якасці інтэрна ў Смітсанаўскім інстытуце (ЗША), у 1995 г. быў запрошаным даследчыкам ва Універсітэце Дж. Вашынгтона (ЗША), у 1997 г. – у Амстэрдамскім універсітэце (Нідэрланды), а ў 2004 г. стаў стыпендыятам праграмы Фулбрайта ў Кліўлендскім мастацкім музеі (ЗША).

Аляксандр Аляксандравіч Гужалоўскі, як вопытны і кваліфікаваны выкладчык, займаецца распрацоўкай адукацыйных праграм. Ён удзельнічаў у падрыхтоўцы многіх спецыялістаў у галіне музейнай справы. Можна з упэўненасцю казаць, што сёння ў кожным дзяржаўным музеі знойдзецца супрацоўнік, які ганарыцца тым, што з’яўляецца яго вучнем. Ідэі пра-

CC BY NC

фесара Гужалоўскага ў вялікай ступені вызначылі змест сфарміраванай на гістарычным факультэце сістэмы падрыхтоўкі музеязнаўцаў, былі выкарыстаны пры распрацоўцы трох пакаленняў адукацыйных стандартаў першай і другой ступеней вышэйшай адукацыі і тыпавых вучэбных планаў па спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны», асновай якіх з’яўляюцца дысцыпліны гісторыка-культурнага цыклу.

Вынікам плённай працы Аляксандра Александравіча і яго калег стаў выхад падручнікаў і навучальных дапаможнікаў. Недахоп падобных выданняў быў вельмі адчувальным на пачатковым этапе падрыхтоўкі музейных спецыялістаў на гістарычным факультэце. У суаўтарстве з В. П. Грыцкевічам А. А. Гужалоўскі распрацаваў навучальны дапаможнік «История музеев мира», выдадзены ў БДУ ў 2003 г. Сумесна з Л. У. Бярэйшык стварыў вучэбны дапаможнік для студэнтаў гістарычнага факультэта «Музеі замежных краін» (выдадзены ў дзвюх частках у 2004 і 2008 гг.). На базе шматгадовых навуковых даследаванняў айчыннай гісторыі музейнай справы Аляксандр Александравіч падрыхтаваў вучэбна-метадычны дапаможнік «Гісторыя музейнай справы Беларусі», у якім прадстаўлены комплексны аналіз розных аспектаў дзейнасці музеяў на кожным гістарычным этапе іх развіцця. Гэта выданне забяспечвае не толькі выкладанне музеязнаўчых дысцыплін, але таксама дапамагае ў практычнай рабоце спецыялістаў.

На базе ўласных даследаванняў А. А. Гужалоўскі распрацаваў курсы па гісторыі, тэорыі і методыцы музейнай справы, якія выкладае студэнтам і магістрантам гістарычнага факультэта. Галоўную ўвагу вучоны надае даследаванню праблем прэзентацыі матэрыяльнай культурнай спадчыны з дапамогай музейных сродкаў, сацыяльна-культурнай місіі музейных устаноў. Студэнты і магістранты заўжды высока ацэньваюць яго лекцыі за інфарматыўнасць, прадуманасць, прывязку да найноўшых тэарэтычных і практычных распрацовак.

Аляксандр Аляксандравіч актыўна ўдзельнічае ва ўдасканаленні навучальнага працэсу, у вучэбна-метадычным забеспячэнні выкладаемых дысцыплін. Ён распрацаваў тыпавыя вучэбныя праграмы «Гісторыя музейнай справы» і «Тэорыя і методыка музейнай справы».

А. А. Гужалоўскі займаецца навукова-арганізацыйнай дзейнасцю: ён з’яўляецца вучоным сакратаром дысертацыйнага савета пры Беларускім дзяржаўным універсітэце, членам дысертацыйнага савета пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтва, членам экспертнага савета Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па экспертызе навукова-даследчых работ дактарантаў, аспірантаў, саіскальнікаў і студэнтаў, членам Рэспубліканскага навукова-метадычнага савета па пытаннях музейнай справы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Як актыўны сябра грамадскага аб’яднання «Беларускі камітэт Міжнароднага савета музеяў ICOM», садзейнічае далейшаму развіццю музейнай справы ў Беларусі. А. А. Гужалоўскі браў актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні нацыянальных форумаў «Музеі Беларусі». Вучоны з’яўляецца членам навукова-рэдакцыйнай рады выданняў «Беларускі гістарычны часопіс», «Беларускі музей», членам рэдакцыйных калегій часопісаў «Веснік Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Серыя 2, Гісторыя. Эканоміка. Права», «Acta Museologica Lithuanica» (Вільнюскі ўніверсітэт).

Аляксандр Аляксандравіч актыўна ўдзельнічае ў рабоце савета гістарычнага факультэта. Прафесар Гужалоўскі праводзіць экспертызу дакументаў для адкрыцця праграм падрыхтоўкі музейных спецыялістаў у іншых установах вышэйшай адукацыі краіны, аказвае метадычную і кансультатыўную дапамогу. Шмат гадоў супрацоўнічае з Інстытутам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва, удзельнічае ў навукова-арганізацыйнай і вучэбна-метадычнай рабоце іншых навучальных устаноў і музеяў.

Працы А. А. Гужалоўскага займаюць заўважнае месца ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі, што абумоўліваецца не толькі пладавітасцю гісторыка, які мае досыць аб’ёмную навуковую спадчыну (шэсць манаграфій, чатыры вучэбныя дамапожнікі, зборнік гістарычных дакументаў, даведнік і цэлы шэраг артыкулаў – усяго звыш 200 навуковых публікацый), але і ў пэўнай ступені іншымі акалічнасцямі. Па заканчэнні ў 1991 г. аспірантуры Аляксандр Аляксандравіч пачаў актыўна распрацоўваць амаль недаследаваны напрамак айчыннай гістарыяграфіі – гісторыю музейнай справы Беларусі. У выніку з друку выйшлі тры манаграфіі (адна з іх стала асновай для абароны доктарскай дысертацыі), дзе ўзнятая праблема разглядаецца храналагічна да 1991 г.[1]

Абраны даследчыкам навуковы кірунак распрацоўваецца не толькі ў гістарычнай рэтраспектыве. Паступова з’яўляюцца музеязнаўчыя працы метадалагічнага і метадычнага кшталту[2], што ўплывае на замацаванне за А. А. Гужалоўскім статусу прызнанага беларускага музеязнаўцы. Гісторыкам

[1]*Гужалоўскі А. А.* Нараджэнне беларускага музея. Мінск : НАРБ, 2001. 106 с. ; *Гужалоўскі А. А.* Музеі Беларусі (1918–1941 гг.). Мінск : НАРБ, 2002. 176 с. ; *Гужалоўскі А. А.* Музеі Беларусі (1941–1991 гг.). Мінск : НАРБ, 2004. 192 с.

[2]*Гужаловский А. А., Грицкевич В. П.* История музеев мира : учеб. пособие. Минск : БГУ, 2003. 283 с. ; *Гужалоўскі А. А., Бярэйшык Л. У.* Музеі замежных краін : вучэб. дапам. : у 2 ч. Ч. 1. Мінск : БДУ, 2004. 187 с. ; *Гужалоўскі А. А., Бярэйшык Л. У.* Музеі замежных краін : вучэб. дапам. : у 2 ч. Ч. 2. Мінск : БДУ, 2008. 246 с. ; *Гужалоўскі А. А.* Гісторыя музейнай справы Беларусі : вучэб. дапам. Мінск : БДУ, 2012. 303 с.

уздымаецца дастаткова шырокае кола музеязнаўчых пытанняў, такіх як музейная гістарыяграфія, музейная прастора і міжкультурныя камунікацыі, новыя тэхналогіі ў музеі, інтэрпрэтацыя гістарычнага мінулага ў музеі, стратэгіі і перспектывы развіцця беларускіх музеяў і г. д.[3]

Актыўная праца з гістарычнымі крыніцамі XX ст. адкрывае перад навукоўцам новыя вымярэнні А. А. Гужалоўскі ўводзіць у шырокі навуковы ўжытак постаці малавядомых ці забытых вучоных і палітычных дзеячаў, якія фарміравалі культурную стратэгію Беларусі першай паловы стагоддзя[4].

Адначасова пашыраецца і навуковая праблематыка. Гісторыка прываблiваюць пытанні ад паўсядзённасці[5] да распаўсюджвання ў Беларусі ідэй фрэйдамарксізму і сацыял-дарвінізму, вынікам чаго стала наватарская манаграфія, прысвечаная праблемам сексуальнасці ў Савецкай Беларусі ў 1920-я гг.[6]

Зацікаўленасць пытаннем гісторыі ідэй, што заўважаецца ў даследчыцкай практыцы А. А. Гужалоўскага з пачатку XXI ст.[7], становіцца падставай для распрацоўкі тэмы, прысвечанай гісторыі стварэння і функцыянавання сістэмы дзяржаўнага інфармацыйнага кантролю ў БССР у 1919–1991 гг.[8] і вытокаў фарміравання таталітарнай сістэмы[9], што стане, як можна меркаваць, тэмай новага манаграфічнага даследавання.

Свой юбілей Аляксандр Аляксандравіч сустракае ў росквіце творчага таленту, поўны цікавых планаў і ідэй. Ён актыўна працуе над новымі навуковымі праблемамі, крэатыўна выкладае свае курсы, паспяхова кіруе дыпломнымі работамі, магістарскімі і кандыдацкімі дысертацыямі, цесна супрацоўнічае з музейнымі ўстановамі, піша вучэбна-метадычныя дапаможнікі новага пакалення. Калегі, сябры і вучні шчыра віншуюць юбіляра і жадаюць яму далейшых поспехаў і здабыткаў у працы і жыцці.

***Л. У. Бярэйшык*[10]*, В. В. Гарбачова*[11]*,***
***Т. А. Навагродскі*[12]**

[3]Беларуская музеялогія. Бібліяграфічны паказальнік (1991–2012 гг.) / уклад. А. А. Гужалоўскі. Мінск : БДУ, 2013. 145 с.; *Гужалоўскі А. А.* Асноўныя напрамкі развіцця музейнай справы ў Рэспубліцы Беларусь // Музей і культурная спадчына: гісторыя, сучаснасць, погляд у будучыню: да 25-годдзя адкрыцця спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» (па напрамках) на гістарычным факультэце БДУ : зб. матэрыялаў Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 27–28 чэрв. 2017 г.) / БДУ ; рэдкал.: А. А. Гужалоўскі [і інш.]. Мінск, 2017. С. 3–14 ; *Гужалоўскі А. А.* Музеі Беларусі перад новымі выклікамі стагоддзя // Беларус. музей. 2019. № 1. С. 20–24.

[4]*Гужаловский А. А.* Маркел Емельянович Макушок // Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1931–1961) / А. Д. Король [и др.] ; под общ. ред. А. Д. Короля, науч. ред. О. А. Яновский. Минск, 2018. С. 277–283.

[5]*Гужалоўскі А. А.* Антрапалогія рэвалюцыі: паўсядзённае жыццё мінчан у 1917 г. // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Гісторыя. 2017. № 3. С. 20–29.

[6]*Гужалоўскі А. А.* Сексуальная рэвалюцыя ў Савецкай Беларусі. 1917–1929 гг. Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017. 258 с.

[7]«Міласці вашай просім…», альбо Адзін год у навейшай гісторыі Беларусі, адлюстраваны ў лістах, заявах, скаргах і іншых формах звароту грамадзян : зб. дак. / уклад. А. А. Гужалоўскі. Мінск : НАРБ, 2006. 280 с.

[8]*Гужалоўскі А. А.* Чырвоны аловак : нарысы па гісторыі цэнзуры ў БССР : у 2 кн. Кн. 2. 1943–1991 гг. / Мінск : А. М. Янушкевіч, 2018. 320 с.

[9]*Гужалоўскі А.* Культ Леніна ў даваеннай БССР // Arche. 2018. № 4. С. 39–54 ; *Гужаловский А. А.* Формирование культа Сталина в БССР в 1934–1939 гг. // Журн. Белорус. гос. ун-та. История. 2019. № 3. С. 57–67 ; *Гужалоўскі А. А.* Культ Сталіна ў беларускім выяўленчым мастацтве // Беларус. гіст. часоп. 2019. № 10. С. 3–18.

[10]*Лилия Владимировна Берейшик* – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры этнологии, музеологии и истории искусств исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Лілія Уладзіміраўна Бярэйшык* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Lilia V. Berejshik,* PhD (history), docent; associate professor at the department of ethnology, museology and history of arts, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *bereischik@bsu.by*

[11]*Ольга Васильевна Горбачева* – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры этнологии, музеологии и истории искусств исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Вольга Васільеўна Гарбачова* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Olga V. Gorbacheva,* PhD (history), docent; associate professor at the department of ethnology, museology and history of arts, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *gor@bsu.by*

[12]*Тадеуш Антонович Новогродский* – доктор исторических наук, профессор; заведующий кафедрой этнологии, музеологии и истории искусств исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Тадэвуш Антонавіч Навагродскі* – доктар гістарычных навук, прафесар; загадчык кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Tadeush A. Novogrodski,* doctor of science (history), full professor; head of the department of ethnology, museology and history of arts, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *novogr@bsu.by*